# ПАРЫЖСКАЕ КАМЮНІКЕ

Парыж, 25 траўня 2018 года

Праз дваццаць гадоў пасля падпісання Сарбонскай дэкларацыі, на сустрэчы ў Парыжы 24 і 25 траўня 2018 года, мы, міністры, адказныя за сферу вышэйшай адукацыі, жадаем не толькі адсвяткаваць дасягненне прагрэсу ў будаўніцтве Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі за апошнія два дзесяцігоддзі, але і вызначыць новыя рашучыя і амбітныя абавязкі па яе далейшым развіцці.

Мы ганарымся тым, што было дасягнута ў межах Балонскага працэсу за гэты час. Мы пабудавалі нешта сапраўды ўнікальнае - Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі (ЕПВА), мэты і палітыка якой былі спачатку ўзгодненыя на еўрапейскім узроўні, а затым рэалізаваныя ў рамках нацыянальных сістэм адукацыі і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гэта тая вобласць, дзе ўрады, вышэйшыя навучальныя ўстановы і ўсе зацікаўленыя бакі разам фармуюць ландшафт вышэйшай адукацыі і дзе наяўна бачна, чаго можна дасягнуць сумеснымі намаганнямі і неперарыўным дыялогам паміж урадамі і сектарам вышэйшай адукацыі. Дзякуючы ЕПВА, мы праклалі шлях да шырокамаштабнай студэнцкай мабільнасці і ўдасканалілі не толькі супастаўнасць ступеняў і празрыстасць нашых сістэм вышэйшай адукацыі, але і палепшылі іх якасць і прывабнасць. ЕПВА спрыяе ўзаемапаразуменню і даверу і пашырае супрацоўніцтва паміж нашымі сістэмамі вышэйшай адукацыі.

Акадэмічная свабода і акадэмічная сумленнасць, інстытуцыйная аўтаномія, удзел студэнтаў і супрацоўнікаў у кіраванні ўстановамі вышэйшай адукацыі (УВА), грамадская адказнасць за вышэйшую адукацыю і адказнасць саміх УВА фармуюць аснову ЕПВА. Калі мы бачым, як у некаторых краінах гэтыя фундаментальныя каштоўнасці апошнім часама ставяцца пад сумнеў, мы бярэм на сябе рашучы абавязак садзейнічаць і абараняць іх ва ўсёй прасторы ЕПВА шляхам паглыбленага палітычнага дыялогу і супрацоўніцтва.

З часоў падпісання Сарбонскай і Балонскай дэкларацый, сістэмы і інстытуты вышэйшай адукацыі ЕПВА перажылі маштабныя рэформы. У момант, калі Еўропа сутыкаецца з важнымі сацыяльнымі выклікамі - ад беспрацоўя і сацыяльнай няроўнасці да пытанняў міграцыі і нарошчвання палітычнай палярызацыі, радыкалізму і гвалтоўнага экстрэмізму - вышэйшая адукацыя можа і павінна адыгрываць вырашальную ролю ў забеспячэнні адказаў на гэтыя пытанні. Яна таксама павінна адыгрываць ключавую ролю ў вызначэнні крытычных пытанняў, у выніку грамадскага абмеркавання якіх прымаюцца важныя рашэнні. Забяспечваючы студэнтаў і іншых навучэнцаў магчымасцямі для

асабістага развіцця на працягу ўсяго жыцця, вышэйшая адукацыя павышае верагоднасць іх працаўладкавання, а таксама заахвочвае іх быць актыўнымі грамадзянамі ў дэмакратычным грамадстве.

Такім чынам, мы абавязваемся распрацоўваць  палітыку, якая будзе заахвочваць і падтрымліваць установы вышэйшай адукацыі ў выкананні імі свайго сацыяльнага абавязку і садзейнічаць развіццю больш згуртаванага і інклюзіўнага грамадства шляхам большага міжкультурнага ўзаемапаразумення, павышэння грамадзянскай актыўнасці і этычнай дасведчанасці нашых грамадзян, а таксама забеспячэння ім роўнага доступу да вышэйшай адукацыі.

## *Прагрэс у імплементацыі ўзгодненых рэформ*

Як дэманструе Справаздача пра ход імплементацыі балонскіх рэформ (2018  г.), быў дасягнуты пэўны прагрэс увогуле, аднак у розных праграмных сферах і ў розных краінах імплементацыя праходзіць нераўнамерна.

Забеспячэнне якасці з'яўляецца ключавым фактарам росту ўзаемнага даверу ў ЕПВА, а таксама павышэння мабільнасці і справядлівага прызнання кваліфікацый і перыядаў навучання. Такім чынам, мы прызнаем дасягненне прагрэсу ў імплементацыі “Стандартаў і рэкамендацый забеспячэння якасці Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ESG)” і пераўтварэння іх у нацыянальныя і інстытуцыйныя практыкі ў большасці краін ЕПВА і мы бярэм на сябе абавязак па ліквідацыі перашкодаў на шляху да прывядзення ESG у адпаведнасць з нацыянальнымі заканадаўствамі і нарматыўна - прававымі актамі. З мэтай стымулявання стварэння большай колькасці сумесных праграм і ступеняў мы будзем таксама садзейнічаць і заахвочваць выкарыстанне “Еўрапейскага падыходу да забеспячэння якасці сумесных праграм” у нашых сістэмах вышэйшай адукацыі. Мы вітаем і будзем спрыяць развіццю Базы дадзеных вынікаў знешняга забеспячэння якасці (DEQAR).

Мы прыкладзем усе намаганні для далейшага развіцця мабільнасці і прызнання ва ўсёй прасторы ЕПВА, каб гарантаваць, што супастаўныя кваліфікацыі вышэйшай адукацыі, атрыманыя ў адной краіне ЕПВА, будуць аўтаматычна прызнаныя на тых жа падставах і на тых жа ўмовах ў іншай краіне ЕПВА, з мэтай атрымання доступу студэнтаў да далейшага навучання і рынку працы.  З гэтай мэтай мы перагледзім нашы абавязкі для таго, каб гарантаваць імплементацыю ECTS у поўным аб'ёме, з улікам усіх інструкцый, выкладзеных у Кіраўніцтве па выкарыстанні Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў (2015 г.).

Мы будзем працаваць для таго, каб імплементаваць Лісабонскую канвенцыю Рады Еўропы/ЮНЕСКА па прызнанні і яе рэкамендацыі, у прыватнасці, па прызнанні кваліфікацый бежанцаў, вымушана перамешчаных асобаў і асобаў, якія знаходзяцца ў набліжаным да бежанцаў становішчы. Мы таксама заклікаем усталёўваць празрыстыя працэдуры прызнання кваліфікацый, папярэдняга навучання і перыядаў навучання, якія будуць падтрымлівацца функцыянальна сумяшчальнымі лічбавымі рашэннямі.

Мы ўхваляем прыняцце прапанаванага дапрацаванага Дадатку да дыплома і даем абавязак працаваць для яго прыняцця у ідэнтычных версіях у адпаведных рамках Лісабонскай канвенцыі па прызнанні і пашпарту мабільнасці Europass. Для далейшага развіцця мабільнасці студэнтаў і выпускнікоў УВА, мы вітаем і падтрымліваем ініцыятывы, падобныя дыгіталізацыі Дадатку да

дыплома, і даем абавязак падтрымліваць УВА у правядзенні імі далейшага абмену дадзенымі студэнтаў у бяспечным фармаце, пры іх функцыянальным сумяшчэнні і магчымасці счытвання дадзеных кампутарам, у адпаведнасці з заканадаўствам па ахове дадзеных. Мы таксама з цікавасцю адзначаем дзеючы пілотны праект ЕС "Еўрапейская студэнцкая картка", якае мае патэнцыял для пашырэння і палягчэння падтрымкі мабільнасці студэнтаў на ўсёй прасторы ЕПВА.

У рамках многіх з нашых навучальных сістэм кваліфікацыі кароткага адукацыйнага цыклу на аснове ECTS адыгрываюць усё больш важную ролю: яны рыхтуюць студэнтаў да працоўнай дзейнасці і далейшага навучання, а таксама павышаюць грамадскую згуртаванасць шляхам палягчэння доступу да навучання для тых людзей, хто ў іншых абставінах не стаў бы разглядаць магчымасць атрымання вышэйшай адукацыі. Таму мы ўключаем кваліфікацыі кароткага цыклу як самастойныя кваліфікацыі ва Усеабдымную рамку кваліфікацый ЕПВА. Кожная краіна можа вырашаць, ці трэба і якім чынам інтэграваць кваліфікацыі кароткага цыклу ў сваю нацыянальную рамку кваліфікацый.

## *Раскрыццё поўнага патэнцыялу ЕПВА: паступовы рух наперад*

Мы ўсведамляем, што рэформы ў рамках Балонскага працэсу патрабуюць паспяховай імплементацыі і адначасова поўнай адказнасці за ўсе ўзгодненыя мэты і прынятыя на сябе абавязкі на ўсёй прасторы ЕПВА. Выкананне намі абавязкаў залежыць ад узгодненых намаганняў палітыкаў, нацыянальных органаў дзяржаўнай улады, адукацыйных устаноў, іх супрацоўнікаў, студэнтаў і іншых зацікаўленых бакоў, а таксама належнай каардынацыі дзеянняў на ўзроўні ЕПВА.

З мэтай поўнага раскрыцця патэнцыялу ЕПВА і гарантавання выканання ўсімі ўдзельнікамі ключавых абавязкаў у рамках Балонскага працэса, мы прымяняем падыход структураванай калегіяльнай падтрымкі на аснове салідарнасці, супрацоўніцтва і ўзаемнага абмену ведамі і досведам. У перыяд з 2018 па 2020 год праца тэматычных калегіяльных груп будзе сканцэнтраваная на трох ключавых абавязках, якія маюць вырашальнае значэнне для паляпшэння і падтрымкі якасці і супрацоўніцтва ўнутры ЕПВА:

- наяўнасць сістэмы трох адукацыйных цыклаў, сумяшчальнай з Усеабдымнай рамкай кваліфікацый ЕПВА, і нарміраванне ступеняў першага і другога цыкла згодна ECTS;

- адпаведнасць Лісабонскай канвенцыі па прызнанні;

- забеспячэнне якасці ў адпаведнасці са Стандартамі і рэкамендацыямі забеспячэння якасці ЕПВА.

Мы даручаем Назіральнай групе Балонскага працэсу (BFUG) ажыццяўляць, каардынаваць і сачыць за прымяненнем падыходу структураванай калегіяльнай падтрымкі. Для дапамогі ёй у гэтым была створаная Каардынацыйная група па імплементацыі балонскіх рэформ. Яна прааналізуе першы крок калегіяльнай падтрымкі і праз BFUG прапануе накірунак будучых дзеянняў, пра што яна паведаміць нам на наступнай канферэнцыі міністраў ЕПВА у 2020 годзе.

Мы заахвочваем выкарыстанне праграмы Erasmus+ для пашырэння супрацоўніцтва ў розных абласцях, не кажучы пра мабільнасць, і для дасягнення прагрэсу па ключавых абавязках.

Беларусь далучылася да прасторы ЕПВА у 2015 годзе на падставе ўзгодненай дарожнай карты. Мы прызнаем, што былі распачатыя некаторыя першапачатковыя рэформы, але застаецца таксама

вялікая колькасць істотных выклікаў. Мы вітаем абавязак Беларусі працаваць з партнёрамі і пры іх падтрымцы імплементаваць прапанаваную на 2018 - 2020 гады стратэгію.

## *Інавацыі ў навучанні і выкладанні*

На працягу апошніх 20 гадоў, ключавой місіяй Балонскага працэсу і галоўнай мэтай яго структурных рэформ было забеспячэнне і павышэнне якасці і актуальнасці навучання і выкладання. Навучанне на працягу ўсяго жыцця становіцца ўсё больш важным для грамадства і эканомікі, а таксама для дабрабыту нашых грамадзян. Настаў час уключыць супрацоўніцтва ў практыкі інавацыйнага навучання і выкладання як яшчэ адну адметную рысу ЕПВА. Такім чынам, мы бярэм на сябе абавязак распрацоўваць новыя і інклюзіўныя падыходы да бесперыўнага ўдасканалення навучання і выкладання ў прасторы ЕПВА, і мы зможам дамагчыся поспеху толькі пры ўмове цеснага супрацоўніцтва з еўрапейскай супольнасцю вышэйшай адукацыі, пры поўным захаванні акадэмічнай свабоды і інстытуцыйнай аўтаноміі.

Поспех Еўрапейскага форуму па навучанні і выкладанні, арганізаванага Еўрапейскай асацыяцыяй універсітэтаў у мінулым годзе, дэманструе каштоўнасць і патэнцыял супрацоўніцтва ў галіне навучання і выкладання, з адчувальнымі перавагамі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, супрацоўнікаў і студэнтаў. Такім чынам, у дадатак да мер на нацыянальным узроўні, мы будзем развіваць сумесныя еўрапейскія ініцыятывы па падтрымцы і стымуляванні шырокага спектру інавацыйных метадаў навучання і выкладання, заснаваных на дзейснай перадавой практыцы ў краінах ЕПВА і за яе межамі.

Гэтыя меры будуць уключаць у сябе далейшае развіццё і паўнавартасную імплементацыю студэнтацэнтраванага навучання і адкрытую адукацыю ў кантэксце навучання на працягу ўсяго жыцця. Навучальныя праграмы, якія прапануюць разнастайныя метады і гнуткія траекторыі навучання, могуць спрыяць сацыяльнай мабільнасці і бесперарыўнаму прафесійнаму развіццю, даючы навучэнцам магчымасць вучыцца і атрымліваць дыпломы вышэйшай адукацыі на любым этапе іх жыцця.

Мы будзем падтрымліваць вышэйшыя навучальныя ўстановы ў развіцці і ўдасканаленні іх стратэгій навучання і выкладання. Мы таксама заклікаем УВА прапаноўваць студэнтам міждысцыплінарныя праграмы, а таксама спалучаць акадэмічнае навучанне і  навучанне на працоўным месцы. Студэнты павінны атрымаць досвед даследчай дзейнасці або дзейнасці, звязанай з даследаваннямі і інавацыямі, на ўсіх узроўнях вышэйшай адукацыі для развіцця крытычнага і творчага мыслення, якое дазволіць ім знаходзіць нестандартныя адказы на новыя выклікі. У сувязі з гэтым, мы бярэм на сябе абавязак па ўзмацненні ўзаемасувязяў паміж адукацыяй, даследаваннямі і інавацыямі.

Дыгіталізацыя  адыгрывае сваю ролю ва ўсіх сферах жыцця грамадства, і мы прызнаем яе патэнцыял для трансфармацыі  таго, як прапануюцца паслугі вышэйшай адукацыі і як людзі вучацца  на розных этапах свайго жыцця. Мы заклікаем нашыя вышэйшыя навучальныя ўстановы рыхтаваць сваіх студэнтаў і падтрымліваць выкладчыкаў у прымяненні творчых метадаў навучання і выкладання ў лічбавым асяроддзі. Мы будзем заахвочваць нашы сістэмы адукацыі больш эфектыўна прымяняць лічбавыя і змешаныя віды адукацыі, пры адпаведным забеспячэнні якасці, з мэтай большага выкарыстання навучання на працягу ўсяго жыцця і гнуткіх траекторый навучання, стымулявання прымянення лічбавых навыкаў і кампетэнцый, паляпшэння аналізу дадзеных, адукацыйных даследаванняў і прагнозаў, а таксама ліквідацыі нарматыўных перашкодаў да прадастаўлення

адкрытай і лічбавай адукацыі. Мы заклікаем BFUG узняць пытанне дыгіталізацыі ў свой наступны працоўны перыяд.

Паколькі высакаякаснае выкладанне мае сутнаснае значэнне для стымулявання развіцця высакаякаснай адукацыі, акадэмічны кар'ерны рост выкладчыкаў павінен грунтавацца на іх паспяховых даследаваннях і якасным выкладанні. Варта таксама належна ацэньваць іх унёсак у паляпшэнне жыцця грамадства.

Мы будзем заахвочваць і падтрымліваць інстытуцыйныя, нацыянальныя і агульнаеўрапейскія ініцыятывы па правядзенні педагагічных трэнінгаў, заахвочванні бесперарыўнага прафесійнага развіцця выкладчыкаў УВА і знаходзіць новыя спосабы лепшага прызнання іх высакаякаснага і інавацыйнага выкладання.

## *ЕПВА на перыяд пасля 2020 года: яшчэ больш амбітныя планы*

ЕПВА зацвердзіла сваю ролю ў якасці ўнікальнай структуры для супрацоўніцтва ў прадастаўленні вышэйшай адукацыі ў Еўропе. Для далейшага развіцця ЕПВА, мы будзем умацоўваць міждысцыплінарныя і трансмежавыя напрамкі супрацоўніцтва, а таксама распрацоўваць інклюзіўны і інавацыйны падыход да навучання і выкладання. Мы заклікаем BFUG прадставіць свае прапановы напярэдадні нашай наступнай сустрэчы ў 2020 годзе для таго, каб сфера вышэйшай адукацыі змагла рабіць свой паўнавартасны ўнёсак у вырашэнне пытанняў, з якімі сутыкаюцца нашы грамадствы.

Мы будзем заахвочваць і пашыраць інтэграванае міжнацыянальнае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі, навуковых даследаванняў і інавацый для павышэння мабільнасці персаналу, студэнтаў і даследчыкаў, а таксама для з'яўлення большай колькасці сумесных праграм навучання на ўсёй прасторы ЕПВА. Мы з цікавасцю адзначаем нядаўнюю ініцыятыву ЕС “Еўрапейскія ўніверсітэты” і мы заклікаем усе нашы УВА удзельнічаць у ёй. Мы заклікаем BFUG наладзіць узаемадзеянне з Еўрапейскай даследчай прасторай і Камітэтам па інавацыях (ERAC) да 2020 года ў мэтах развіцця сінэргіі паміж ЕПВА і Еўрапейскай даследчай прасторай (ERA).

Мы бярэм на сябе абавязак развіваць ролю вышэйшай адукацыі ў гарантаванні ўстойлівай будучыні нашай планеты і нашых грамадстваў і ў вынаходжанні спосабаў, у якіх мы ў якасці міністраў ЕПВА зможам спрыяць сустрэчы, прысвечанай Мэтам устойлівага развіцця ААН на глабальным, еўрапейскім і нацыянальным узроўнях.

У якасці дзейнасці па выніках правядзення Балонскага палітычнага форума, мы даручаем BFUG уступіць у глабальны дыялог па палітычных пытаннях для ўдасканалення рэгулярнага супрацоўніцтва з іншымі рэгіёнамі і міжнароднымі арганізацыямі. Гэты дыялог павінен мець на мэце заахвочванне ўзаемнага навучання і развіцця сумесных ініцыятыў па пытаннях агульных інтарэсаў, такіх як сацыяльная інклюзія і пашырэнне ролі вышэйшай адукацыі. Мы вітаем працу над Сусветнай канвенцыяй ЮНЕСКА па прызнанні кваліфікацый вышэйшай адукацыі.

Мы прызнаем неабходнасць далейшай працы для ўмацавання сацыяльнага аспекту вышэйшай адукацыі. Для таго, каб выканаць сваё абяцанне забяспечыць адлюстраванне шматстайнасці насельніцтва Еўропы ў складзе абітурыентаў і выпускнікоў еўрапейскіх устаноў вышэйшай адукацыі, мы будзем садзейнічаць доступу да вышэйшай адукацыі недастаткова прадстаўленых і ўразлівых

груп насельніцтва. Такім чынам, мы даручаем BFUG прасоўваць гэтае пытанне на наступнай канферэнцыі міністраў ЕПВА.

### *Падрыхтоўка да канферэнцыі міністраў ЕПВА у 2020 годзе*

Да нашай канферэнцыі, якая пройдзе ў 2020 годзе, мы даручаем BFUG распрацаваць Справаздачу пра ход імплементацыі балонскіх рэформ. У ім трэба даць ацэнку асноўным дасягненням ЕПВА з самага запуску Балонскага працэсу, уключаючы апісанне таго, у якім аб'ёме мы выканалі мэту мабільнасці, агульнаўзгодненую ў г.Лёвэн/Лувен-ла-Нёв у 2009 годзе.

Мы таксама просім BFUG прадставіць свае прапановы па асноўных накірунках дзейнасці на наступнае дзесяцігоддзе, у цесным супрацоўніцтве з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, супрацоўнікамі і студэнтамі, а таксама прапановы па кіраванні ЕПВА.

Мы з удзячнасцю прымаем прапанову Італіі правесці ў сябе наступную міністэрскую канферэнцыю і Балонскі палітычны форум у 2020 годзе.

## Дадаткі

### *Прынятыя меры:*

- Падыход структураванай калегіяльнай падтрымкі для імплементацыі трох ключавых абавязкаў Балонскага працэса

- Стратэгія для Беларусі на 2018 - 2020 гады

- Кваліфікацыі кароткага цыклу як самастойны кваліфікацыйны ўзровень ва Усеабдымнай рамцы кваліфікацый Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (QF-EHEA)

- Перапрацаваны Дадатак да дыплома, з рэкамендацыяй па яго прыняцці ў ідэнтычнай форме ў адпаведных рамках Лісабонскай канвенцыі па прызнанні і пашпарта мабільнасці Europass